# ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ

1931

XVIII

№ 19

КАСТРЫЧНІК






Спаборніцтвы беларускай вайсковай акругі. Выдача першага прызу лепшаму кавалерыйскаму разьдзелу.
Фото САЛАВЕЙЧЫКА

# Зьмест:



Выданьне Белар...




Пралетары ўсіх краін, злучайцеся!

# Чырвоная Беларусь

№ 19

Кастрычнік
1931

Адрас рэдакцыі:
Менск, Савецкая, 59,
Тэлефон 17—09



Завод імя Варашылава (г. Менск) упяршыню ў СССР выпусьціў з складаных сьвідравальных варштаты.
Да гэтага часу яны ўвозіліся з-за мяжы. На здымку: сьвідравальны варштат заканчваецца зборкай.

Фото Палічанскага

# Насыпаны курган

Сымон Баранавых

Урывак з аповесьці

Стары Нічыпар коні саўгасаўскія на выган выправіў з Адамам. Хамуты баранавалочныя разьвесіў у канюшні на кручкох. Да іх, на дзьверах, прыставіў замочную варту.

Замкнуў—пацягнуў, праверыў, Нічыпар, за замочную дужку жалезнага замка—пута.

Ды сваёю думкаю скінуў:

— Схаджу да Вялікага Каменю... прайдуся.

Некалькімі крокамі ўжо быў зьмер ў ад канюшнікі, як вырашыў нанава:

— Вазьму вуду мо' што ўдасца злавіць каля рэчкі. Надвячорак, здаецца, што бяз ветру. Вада карабаціцца ня будзе.

Глянуў з-пад брывей на неба, на лісьце р скінутых клянoў, лі :

— Ціха. Не страпаецца вецер паміж лісьця.

Калі-ні-калі ходзіць Нічыпар да Вялікага Каменю, што над рэчкаю за саўгаскімі будынкамі. Там ён садзіцца на зялёную мураву і, ашчарэпіўшы свае калені жылістымі рукамі, глядзіць тупым нямігаючым зіркам. Бровы яго калматыя, як ветрам расьцярушаныя, і асупліваюцца, а твар—маршчынамі пакрэмзаны—робіцца глыбокім, задумёным. Доўга часамі сядзіць стары, глядзіць аж за сьлязьлівую рэчку.

А яна, калі глядзіць з гары Нічыпар, і ўпраўду сьлязьлівая, як і яго старыя вочы. Тышчыцца рэчка, працiскаецца, прапазіць пішчаніцаю—абгінае, як падымае на сваім шкляным целе—саўгас Чырвонае.

Стаіць саўгас на высокай узгорыстай мясьціне. За чатырнаццаць кілёмэтраў укругавую відаць ён. Як на далонь паставіў нехта ды трымае, каб глядзелі, каб бачылі.

Едзеш на Клінкі—відаць, на Пярэкуль едзеш—відаць.

Далёка, далёка ад'едзешся, а ён як і тутака каля цябе, разам з табою Як і не ад'ехаўся ты.

Аж добра, што ты і заехаў і бачыш адкуль ты выехаў.

Вясною, калі дрэвы абрастаюць лісьцямі, ня відаць з-за іх чырвонаўскіх будынкаў. Яны зелянівам, як паводкаю веснавою, затопленыя. Па восені-ж, калі ліст жоўтаю фарбаю састарыцца—здалёк як апырскана Чырвонае залатым друзам. Вельмі-ж перад тым, калі сонца, як шахцёр той, зьбіраецца пад зямлю пралезьці, з латы друз тады на лісьцях агнём гарыць. Тады саўгас Чырвонае, як і ў сапраўды афарбаваны ў чырвоны колер.

Калі сядзіць Нічыпар над рэчкаю, думкі ў старога чаўпакам саўгаюцца—вытыкаюць цэлае палатнянае поле.

Чаго заходзіць Нічыпар да Вялікага Каменю?—а адгэтуль добра відаць—лепш як адкуль, чырвонаўская ваколіца. І мураўейнікі, і Бярчукі відаць, і хутары малінаўскія.

Хутары распуджаным стадкам разьбегліся, не сабраць іх па полі.

Стары Нічыпар і ў гэтым шуме чуе гаворку свайго Максіма—мельніка.

У мінулым годзе колам млынаўскім, што чатыры камяні круціць, калі вады хапае—падхапіла Нічыпарава сына Максіма.

Раз, два... страсанула на хаду, падняла яго на высокае свае месца—апусьціла праз верх і ўніз галавою апусьціла...

Не спазнаў Нічыпар твару свайго сына, калі зірнуў. Толькі і спазнаў па камякох салдацкай ватоўкі, у якой прышоў ён з чырвонай службы.

Стары гаварыў:

— І на Франгеля хадзіў, і на Шкуру, і ў Пецярбурзе на лёдзе біліся, а цэлым прышоў, а тут на табе—нягода стрэла.

Чуткі з патайка, пасьля, хадзілі па ваколіцы пра Максіма...

А Максім членам быў выбраным, сельсаветчыкам. У Мураўейніках зямлю знайшоў, што была ў кнігі сельсавецкія ня прыпісана.

Чуткі на ціхіх нагах, на кончыках пальцаў хадзілі. Было ў тых чутках, што Максім стаяў перад млынявым колам разам з мураўейнікаўскім завозьнікам, з Танцулькам.

... Потым Танцульку бачылі, як ён трапяткімі крокамі ішоў на двор. А калі млын за танавілі—з двара прыбег з вялікаю бядою, з горам пра Максіма.

З нейкім часам пра здарэньне на бярчукоўскім млыне чуткі тыя ні то прыталіся дзе, ні то ўтаміліся хадзячы: ня чутно было і няга шораху. А жыцьцё ізноў колам тым млынавым пайшло ў кругавую

Цяжка засыцца Нічыпару пра свайго сына. Вельмі-ж добрым быў яго Максім. Дзе ня быў, пра бацьку памятаў: люльку—файку прыслаў аж з службы.

Ня плакаў стары ні разу па сваім сыне. Нічыпар і ў жыцьці сваім ня плакаў: моцныя ў Нічыпара сьлёзы.

— Навошта іх разьліваць,—жартуе Нічыпар,—выльлеш—другія трэба набываць. Сьлёзы заўсёды павінны каб былі ў чалавека на пашэве. Мала што ў жыцьці можа стрэць, дык ня будзе чым і абараніцца. Сьлёзы—чалавечая абарона.

Доўга будзе, часамі, сядзець Нічыпар каля Вялікага Каменю над рэчкай затаканы мінулымі днямі.

Праходзяць у старога думкі адна за другою чародамі. Ідуць і больш трапяткія і больш жвавейшыя—адна другую абганяюць. А з імі ідзе і сам Нічыпар. Пабывае ён з думкамі з пакамечанаю шапкаю пад пахаю ў Калечыца, што любіў пераганяць чужую работу на чырвоныя бліскучыя гузікі. Пабывае і ў маладога Калечыца перад пакамечанымі кулакамі:—жарабец, што белымі рублямі сьвеціцца, вырваўся з рук у Нічыпара.

Кажа Нічыпар:

— Стары Калечыц быў лепшы за маладога.

І ізноў на тое-ж самае месца прыходзіць з думкамі—да свайго сына Максіма.

А калі хто падсядае да старога Нічыпара, кажа ён сваім думкам „пачакайце“.

Рад Нічыпар чалавеку, рад пагаварыць...

Ён можа расказаць шмат чаго, бо жыцьцё перайшоў—ня поле перакінуў вокам.

Пра зямлю, на якой стаіць саўгас Чырвонае, паданьне старымі гадамі ходзіць. Нічыпар і пра паданьне раскажа.

— Дзе цяпер гара, а на гары Чырвонае—было некалі, кажуць, лагчына. А на лагчыне, дзікім мохам зросшае, было балота. Непраходнае было тое балота, нага чалавека ніколі ня ступала на яго дзікі мох. На ём расла невядомая трава, што празывалася Балацянкаю. Трава гэта, на Новы год зацьвітала. Маразы на двары, сьнег... а з-пад сьнегу прабівалася і зацьвітала белым цьветам Балацянка...

— Кажуць, трава гэта так цьвіла, як на Івана Купала цьвіце папараць: ноччу і адзін раз на новы год. Цьвет бачылі сваімі вачыма. Ён гарэў на сьнезе лупаючымі агоньчыкамі, як сьвечкамі...

— А яшчэ апавядаюць, як тут зрабілася гэта балота. Кажуць, раней было тут цьвёрдае дно. Яно было ўсё зялёнае, жывучае. Крыніца была на тым цьвёрдым дне. Вада як дзень, як ноч—уздымалася ўверх. Вада крынічная тая людзей жывіла ад усялякіх хвароб. Здалёк прыходзілі—прыяжджалі, каб набраць лекаў. Усякаму было можна падступіцца да той крыніцы. І от аднойчы прышоў да жыватворчай вады злачынец на ўвесь сьвет. Ён праз усё сваё жыцьцё жыў аднымі зьдзекамі над людзьмі. Шмат людзей праз яго загінула Дык злачынец той хацеў у жыватворчай крыніцы выкупіць свае грахі. Але калі дакрануўся ён да тэй вады—праваліласся скрозь зямлю ўсё зялёнае дно і тое крынічнае месца, і людзі што былі там, разам з злачынцам. От з таго часу і было тут непраходнае балотца з травою Балацянкаю.

— З таго часу, як загінула крыніца жыватворчая—на палёх пайшоў недарод, пайшла па людзях пошасьць. Розныя хваробы хадзілі па людзях—забіралі з сабою людзей у зямлю. Апавядаюць, што гэтак было доўга—цэлыя вякі. Людзі нават пайшлі на недарод.

— А над гэтым балотцам жыў вялікі ваявода. Уся краіна дрыжэла перад сярдзітым ваяводам. Палацы яго стаялі якраз на тым курганчыку, што налева цяпер ад Чырвонага. Палацы ваяводы былі пабудаваны вокнамі на затопленае зялёпае дно. Кожную ноч, кажуць, як затанула дно крынічнае, калі клаўся ваявода спаць,—прыходзілі да яго ў палацы мерцьвякі—тыя людзі, што загінулі разам з крыніцай. Яны адчынялі дзьверы, вокны насьпеж... Іх было так шмат... Яны гразіліся ваяводу, што нібы-та ў іх пагібелі вінаваты ён. Праз яго не маглі жыць яны на такім аздобным сьвеце.

— Тады ліхі ваявода расьсярчаў на тое балотца і загадаў сваім людзям засыпаць яго пяском. І людзі паднявольныя таго ваяводы насыпалі вялікі курган.

— „Яшчэ вышэй сыпце,—загадваў ваявода сваім людзям,—яшчэ вышэй, каб ніхто ні вылезьлі тыя, што пайшлі на дно. А каб ніякага ўспаміну не засталося пра гэта месца—ваявода загадаў перанесьці на насып свае палацы. Ото-ж з таго часу і ня зводзіліся палацы з узгорку. З таго часу і відаць ён на чатырнаццаць вёрст.

Што толькі людзкімі гаворкамі ня ходзіць па сьвеце. А даўніка яна і пагатоў—вельмі любіць хадзіць. Яна і вялмуручая—часу ў яе колькі хочаш. Ходзіць яна ад адных людзей да другіх бабаю-пляткаркаю, ды галовы людзкія забівае тлумам. А жыцьцё людзкае непадатлівае—голаю рукою яго ня возьмеш.

...Шанцавала Нічыпару гэтым вечарам на рыбу. Добра зрабіў, што ўзяў з сабою вуду, ды з гары сышоў. Абы ткнуў хлебным кручком у ваду і пачне хадзіць вуда па вадзе як жывая, Спраўляйся толькі падымаць з асьцярогаю вудзілішча: глядзі. каб стрывала вуда, пакуль скончыць плотка свой танец.

Але змрок насупіўся вожыкам і ад рэчкі вільгацьцю дыхнула. Жабкі-квактухі загаманілі ярчэй, байчэй. Слонка сьмелымі крыльлямі разрэзала надвячорак у старога над галавою. Жукі гайсалі навыперадкі адзін за другім, як нечага шукалі згубленага .. Тады зматаў Нічыпар сваю вуду.

Цяжка ўзыходзіць да Вялікага Каменя ад рэчкі: крутаватая, старчма ўзьнятая сьцежка. Ды і старасьць Нічыпарава большым стурчаком узьнята за самую сьцежку: у абход пайшоў стары, каля ўзгорку.

І ўжо ў прысады выйшаў...

У руках нёс кацялок з плоткамі. Яны трапяталіся ў вадзе, плёхаліся, як малыя дзеці.

— Та-ат-ка...—разьляглося раптоўнае рэха па ваколіцы.

— Та-ат-ка...

Нічыпар спазнаў голас сваёй дачкі Манечкі. Гэта яна прышла з палявой работы. Дома не застала бацькі, дык голасам сваім вобыск зрабіла сярод надыходзячага вечару.

— Я тутака...--адгукнуўся стары.

А яна ведала, што ён бывае каля Каменя—туды і пайшла клікаць. Не застала старога і дрыжачы голас апанаваў.

Праз хвіліну Манечка стаяла каля бацькі з засопшыміся грудзьмі. Яна была босая, у руках трымала белую хустку. Успацеўшы быў твар—наліты заірдзеўшымі бурнэлькамі шчокі. Не магла адсапнуцца, слова не магла вымавіць. Дыхала хутка, хутка: усёроўна, як баялася, што ня хопіць у яе часу.

— Татка...—сказала Манечка ўрэшце,—а я вас шукаю...

— Навошта... Я і сам ўжо іду дахаты,—глядзеў Нічыпар на ўзьнятую імпэтную маладосьць сваёй дачкі.

— Да нас прыехаў з гораду,—сказала яна,—Такарскі Вацік.

— Які Вацік?—запытаўся Нічыпар.

— Вацікам завуць яго, а па прозьвішчу Такарскі,—адказала Манечка.

— Ну дык што... Чаго ён прыехаў?

— Ах, якія вы, татка: „Чаго прыехаў"—жыць прыехаў у наш саўгас. Яго прыслалі, каб Ляксандру памагаў. Ён у нас будзе жыць: Ляксандра яго прызначыў у нашу *тую* хату.

Узяла бацьку за руку:

— Ідзем, татка, хутчэй. Чаго-ж вы стаіце?

Нічыпар гульлівы сьмех рассыпаў на мяхіністай барадзе.

Змрок яшчэ больш насупіўся калматымі бровамі: пачаў Уваходзіць у сваю сілу. Манечка ня прыкмеціла ў змроку бацькавай радаснай усьмешкі над яе маладою наіўнасьцю.

* * *

Раніца расьцьвіла півоністаю кветкаю, вялікаю, ружоваю.

Ужо даўно каровы саўгасаўскія пайшлі зьбіраць канюшыну. Коні пайшлі сарціраваць на полі баронамі трактарную ральлю. Кляўко з сваім сынам, з Муравейнікаў прыйшлі — прыпушчалі драчкаю другое бервяно на новай сырабойні.

Меркавалася, што хараство ранішняга цьвету пратрымаецца цэлым днём, Не паказвала неба, каб зьмінтрэжыць дзень у яго пагодзе-красе.

І Ляксандра, чалавек, што трымае саўгас пад сваім вокам, рад быў: і гэтай ранішняй красе, і гэтаму яркаму стуку тапароў на зрубе, і гэтаму чалавеку—ТакарскамуВаціку — што ўчора прыехаў з гораду да яго ў памоцнікі.

Ляксандра вёў Такарскага да новага зрубу: здалёк хваліўся яго веліччу, пакоўнасьцю.

Яны толькі што былі—агледзелі саўгаскую школу.

У гэтым годзе школа шмат узяла верху. Атожылкамі далася на цэлую пядзю. А яшчэ-ж усё лета ўперадзе.

Няма каму ладзіць вечары,—глядзеў Ляксандра на маўклівы твар Такарскага,—маладыя нашы людзі пражываюць самапасам. Прыдзецца табе палутараваць нашу моладзь. Расчапалася, брат, яна. Стасюк ня ўмее над ёю сакратарыць. Паліцікі не хапае. На ўсе чатыры нагі кульгае іхняя спаняласьць пра паліціку. Табе, брат, прыдзецца выганяць з гэтых ног усю курч.

Каля зрубу новай сырабойні Вацік Такарскі ўбачыў:

Васьмёх мужчын стукалі тапарамі—калупалі пазавую трэску. Пажаваная трэска спрытка ўцякала зьверху ад тапара: каб хаця не хапіў ён яе лішні раз сваім вострым зубам.

Яны ўвайшлі ў сярэдзіну зрубу.

Вацік Такарскі—ад самых формаў, што туга набіваюцца з прасеяным пяском, ад жалезнага малака, што льецца ў тыя формы, каб застываць густа аж да яркага звону.

Калі ўвайшоў у зруб, глянуў з канца ў канец—на ўспамінку стаў іхні цэх. Такі-ж самы даўжынёю, расьцягнуты, шырынёю распасьцёрты. Толькі іхны цэх замурзаны сажаю, а сырабойня сьценамі, як белым сырам сьвеціцца. Дый няма тут, пасярэдзіне, мачыхі—печы, што глытае жалезныя нежаваныя абрэзкі, што закусвае чорным хлебам—вугольлем.

Застанавіліся на ападках-трэсках. Вацік глядзеў на цесьлярскі спрыт у рабоце.

— Гэтыя з Муравейнікаў, — казаў Ляксандра на Вацікаву пільнасьць.—Сын з бацькам... па прозьвішчу Кляўко. А гэта Жур Лаўрэн, таксама з Муравейнікаў. А гэта нашы, саўгасаўскія... Маўчыц вунь. Сын яго, Харытон, за старшыню ў сельсавеце.

Стоячы недалёка ад Лаўрэна Жура, Ляксандра наўмысьля сказаў у моцны слух:

— Таварыш дзядзька Лаўрэн ніколі не адмовіць. Абзавешся яму і калі ў яго часу ў запасе і пазычыць нам свайго часу дзянёк-два...

Жур счуў, што гутарку трымаюць пра яго і тапор свой патарчакаю ўткнуў у бервяно. Нагу перанёс з таго боку сьцяны на гэты бок ды:

— Што гэта, таварыш, да іх прыехалі на пражываньне?

Ваціка цікавасьць узяла глядзячы на гэтага чалавека твар, валасамі заросшы нараўне з яго барадою.

— Да іх...—адказаў Вацік Лаўрэну, а потым дадаў:—І да вас.

— Так, так... Канечне,—гаварыў Лаўрэн,—у іх шмат работы. Яны наймаюць, наймаюць і рады мала. Ім бы яшчэ чалавек з дзесяць...

— А чаму-ж вы тут, гуртам, вёскаю, не памагаеце свайму саўгасу?—сказаў Вацік.

Лаўрэн унурыў свой валасаты твар: вытрасаў пальцамі трэскі з пазу—гаварыў:

— Свая работа. Кожны заняты сваім, як кажуць па-нашаму, разгарненьнем. Думаеце: у нас тэж шмат работы. Але от як папросіць заведуючы Ляксандра... ну-у, раз трэба, дык і трэба... Бугайчыка пусьціць... тое-сёе: у іх-жа свой каваль... ды чалавек ён ня дрэнны: бывае жывёліна прыпрэцца да збажыны...

Ня ўцяміў Вацік апошніх слоў пра бугайчыка, але запытаць не хацеў, баяўся, каб не перапыніць Лаўрэнавай думкі. А ён скідаў трэскі і гаварыў:

— ... пуд жыта, бывае, ні ўцяць, ні ўзяць — Ляксандра і адважыць...

І падняўшы вочы на Ваціка:

— Дык вы, мусіць, тут, кажуць будзеце цэлае лета?

— Буду,—нехаця адказаў Вацік.

А каб зьмесьці гэтую сухасьць з сілаю дадаў:

— Будзем знаёмымі суседзямі.

Хацеў ісьці: Ляксандра стаяў аж у канцы зрубу.

Скрануўся з месца: глядзеў перад сабою, каб не спатыкнуцца аб трэскі.

А Лаўрэн:

— Мо' маеце газэтку?...

Мацнуў Вацік рукамі па кішэні:

— Старая,—сказаў дастаючы з кішэні.

— О тож і добра... Курыць, ведаеце, хочацца, а паперы — хоць запалі—ня трэсьне.

Вацік ішоў ад Лаўрэна і нёс у сваіх думках:

— „Кажуць" прабуду цэлае лета... Як у іх скора ведаюць? Не пасьпеў пераначаваць, як ужо...

Ішоў, а сэрца яго нібы то падтрымлівала аберучкамі цьвітучая раніца. Тады было лёгка, радасна. Але надыходзілі моманты, што як-бы выпускала раніца з сваіх аберучак яго сэрца: — тады цяжкім каменем вісела ці то сэрца само, ці то адзін на сэрцы камень.

І от гэтак яно з Вацікам каторы ўжо год: абы надыйшла радасьць, трывога крадзецца, каб яе адсунуць. Тады робіцца цяжка ўсяму целу. Вацік ведае, што гэта за трывога і ён баіцца яе.

... К вечару ўсе ваколіцы ладамі-пераладамі разьлягаліся пра новага чалавека ў Чырвоным.

У Муравейніках гаварылі:

— Калекцівы прыехаў рабіць. Горад цяперака людзей такіх рассылае на калекцівы...

— У сябе хай горад робіць калекцівы. Чаго яму да нас? Мы ня езьдзім, каб у іхніх заводах, хвабрыках рабіць калекцівы. Мы іх не чапаем.

На Малінаўках гаварылі:

— Ён прыехаў, каб нас выведаць... Каб прачуць, хто што будзе гаварыць на ўласьць. Ён прыехаў пераадзетым...

А саўгасаўскія жанкі:—Юзічыха да Дзям'яніхі—


— Відаць, панятлівы чалавек. Я зайшла да Нічыпара, дык ён еў. Сам выйшаў на кухню, сам і хлеб узяў, і адрэзаў. І лыжку ўзяў з заложніку...

Булгак з Трэцяй Малінаўкі гаварыў на Другой Малінаўцы Данілу Шчупаку:

— Кажуць, што яго прыслала ячэйка, як чалавека спраўнага на язык. Па-мойму, калі язык ходарам ходзіць—розум ляжыць у таго чалавека пад замком.

## Бакінскія промыслы

Малюнак М. Філіповіча



## ТРАКТАРЫСТЫ НЁМА

Верш
Т. АЛЕСІНА

Нёма падышоў да машыны
Шырокае, ды кароткай,
Калі яшчэ па-над далінай
Дзень вісеў у зародку.

Сядло пакруціў—пераправіў
рукою—гэткай трапнаю...
Многа ўзару я папару
табою, мілы мой трактар.

І гул матору трапетнага
Зліўся ў сталёвым звоне;
ён першаю бег выведкаю
на паўкруглыя загоны...

Залажыўшы рукі за шыю,
Нёма ўдыхнуў паветра...
— Эх, ты мая ды машына,
ды пяшчаныя гектары!

Нёма трактарыст—з закалкаю:
і працавіты й сур'ёзны,
таму паабапал галкаю
чарнелі ў яго баразны.

А восень ужо пад гарою
атрасала з дрэваў лісьця;
штурхала жаданьне ў гэроя,
каб зааранць больш іржышча.

Пад поудзень на шэрым галопу
вокам не абкінуць ральлі.
Нёма перавыканаў наметку
і не заўважыў калі—

рэха іржавае рэйкі
гушкалася па-над дзядзінцам;
гайсала па алейках,
па зялёным гасьцінцы...

А там пападала ў алешнік,
вяўшы пад сонца косамі...
Сонца алешнік да рэшткі
пераплятала палосамі.

Прыпякала ў стрэхі будынкаў!
Гразла на чорназёме...
Клікала да перапынку
трактарыстага Нёму.

Тула. Будаўніцтва гіганта мэталюргії на Асінагорскім пляцу. На здымку: копка катлавана пад першую домну



Нарыс
Цімох Мешчаракоў

# Дзе быў уціск і зьдзекі.

У вялікім панскім садзе на яблынях і грушах распукнуліся пахучыя пучкі, пачынала расцьвітаць вішня; з поўдня навяваў цёплы вясновы вецярок, мякка дакранаючыся да верхавін дрэў.

Дом і надворныя будынкі былі бязьлюдны. Вакол панавала мёртвая ціша і пуставаньне. На двары валяліся разьбітыя цэбры з паржавелымі абручамі. Проста на ганку ўверх дном стаяла вядро бяз дужкі, па двары бяселі кавалкі газэт і парванай паперы.

Раніцою, калі сонца паднялася высока, у двор уехалі фурманкі, з якіх сышлі людзі. Іх было чалавек з трыццаць, апрануты яны былі стрыката, не па-тутэйшаму. У руках яны трымалі чамаданы, пашарпаныя дальняй дарогай, на якіх ярка былі відаць наклейкі мытняў і ярлык вакзальных камер захоўвы ручнога багажу.

Фурманкі паехалі, а людзі засталіся. Астаўшыся яны злажылі ў пустым пакоі свае пакункі, і пайшлі на сядзібу, аглядаючы яе з усіх бакоў.

Гэта былі гаспадары сядзібы, батракі і рабочыя, беларусы, якія вярнуліся з Амэрыкі ў родныя мясьціны. Пан Шыбаннў і сусед яго Ельск —уладар эканоміі Ружанопаль—сьпехам сабраліся і паехалі ў панскую Польшчу забраўшы туды ўсю жывёлу і інвэнтар. Засталіся толькі голыя будынкі: дом, сьвіран і некалькі хлявоў.

Чырвоная армія дапамагала працоўным Беларусі выгнаць з чмяліных гнёздаў у якіх дваран і памешчыкаў. Усе, што будавалася, усё, што нажывалася на рабскай працы, потам і кроўю было зьвернута сапраўдным гаспадарам.

Яшчэ да вайны, сяляне-беларусы, заціснутыя з усіх бакоў, ад непасільных падаткаў і хамства паноў, прыставоў і стражнікаў, ехалі цэлымі групамі ў Амэрыку. Аднак, як толькі яны ўчулі, што ў родных краёх наступіла свабода, іх ахапіла імкненьне вярнуцца дамоў. І ўсё-ткі ўдалося вырвацца толькі ў 1921 г.

Прыезжыя „амэрыканцы" разьяжджаліся па сваёй краіне. Многія яшчэ ў дарозе арганізаваліся ў комуны пад кіраўніцтвам комуністычных арганізацый, якія ўзьніклі яшчэ ў Амэрыцы. Вось такой арганізаванай групе праўных ЦВК БССР прадаставіў месца для арганізацыі комуны.

Гэта было слаўнае месца. Добры сад, палі сак, дом—але гэта і ўсе. Была пустэча, было ўсё разьбіта і абшарпана. Ня было на што ні сесьці, ні легчы. Ня было ні лыжкі, ні міскі.

Вечарам усім захацелася есьці. Знайшлі на двары стары, шчарбаты кінуты чыгун, дбайна абмылі яго і зварылі з бульбы бульён. Пахі яды дражнілі здаровы апэтыт, але... ня было лыжак. Хоць рукамі боўтайся. У аднаго знайшлася прылада для галеньня. Прышлося прыстасаваць мыльніцу, з якой хлябалі па чарзе. Зразумела, што абед гэты зацягнуўся.

Комунарам адразу сталі яснымі абставіны. Трэба было пачаць працаваць, і з нічога нешта стварыць. Час—красавік месяц, сяляне з ваколічных вёсак пачынаюць сяўбу, а ў комунараў ніякіх сродкаў вытворчасці, апрача паўтара дзесятка рыдлёвак, купленых яшчэ ў Менску.

Рыдлёўка, дык рыдлёўка. Пакуль хадайнічалі перад арганізацыямі, каб дзе-небудзь дастаць коняй, усе ўзяліся за ральлю рыдлёўкамі.

Труднасьці паўставалі адны за другімі. Недаставала хлеба, недаставала падчас і бульбы. Галоднымі хадзілі за трыццаць вёрст, каб дастаць коняй. Нарэшце ў адным саўгасе адпусьцілі пару коняй, шэсьць кароў і дзесятак авечак. У коняй была

кагоста, яны ледзь падніма́ліся. Калі запрэглі іх у аднаконны плуг, яны я.о не маглі нават з месца крануць. Тады комунары ўпрэгліся самі—два зьлева, два справа, і т.к памагалі коням цягнуць плуг.

А зямлі было многа—231 *га*. І трэба было быць асабліва трывалым, каб ня зьбегчы ад гэтых труднасьцяй. Знайшліся і такія, трэцяя частка ўсё-ткі здала позыцыі—ацуралася комуны, і з трыццаці чалавек, асталося дваццаць тры.

Навакол бадзяліся бандыцкія шайкі, і хоць у комуне была ўсяго адна вінтоўка, але яны сюды так і не заглянулі. Хадзілі чуткі, што ў комунараў былі бомбы, кулямёты і нават гарматы.

На вёсцы камунараў абсьмейвалі ў вочы:

— Зьбяжыце і вы, ня вытрымаеце,—гаварылі ім цярэбячы рукамі бароды, кулакі.—Вы прызвычаіліся ў Амэрыцы беларучнічаць...

Але комунары ня з тых, народ заўзяты, і хоць парт'ячэйка была невялі ай—усяго 8 чалавек, але кіравала яна ўмела і падтрымлівала бадзёры настрой і бальшавіцкі дух сярод беспартыйных.

Мацнела па Беларусі Савецкая ўлада, расьлі комуны, саўга ы—і гэтая комуна „Чырвоная Зьвязда“, пачала забудоўвацца, прыводзіць у парадак гаспадарку, павялічваць дастаткі.

Будаваліся новыя хлявы падлячылі коняй, зьняўшы ўраджай, купілі новых. Патроху зьмяншаліся труднасьці.

Прыгаладзь і ўсё што бывае пры гэтым—засталося ззаду.

Пас ля XV зьезду ЎсеКП б)—яшчэ лепш стала. Адпусьцілі крэдыты. Яшчэ да гэтата, комунары ў 24-м годзе абжаліся трактарам Фордзонам. Гэта быў першы трактар ва ўсёй Беларусі, і сюды ў комуну прыходзілі глядзець на яго работу нават з дальніх вёсак.

У 1929 годзе ў комуну ўліліся новыя члены, сяляне з двух суседніх пасёлкаў. Раней яны працавалі на паноў Ельскага і Шыбанава; запэўніўшыся, што ў комуне можна сапраўды працаваць на сябе, я не на пана, яны прышлі у комуну са ўсім сваім скарбам.

— З гатовага палена можна вогнішча распаліць,—казалі комунары, але сялян у комуну прынялі. Такім чынам, комуна вырасла амаль у тры разы. З ростам членаў раслі і об'ек ы для працы. Павялічылася засеўная плошча, павялічылася малочная гаспадарка, пашыралася садоўніцтва.

У момант організацыі комуны было членаў 23 чал., а цяпер іх 75, ды 68 дзяцей, з які шмат ужо падлеткаў. Агульны п ыбытак вырас значна і ў 1930-м, напрыклад, годзе, дасягнуў 33.260 руб. Кароў комуна мае 83, а было іх шэсьць. На сьвіней таксама зварочваецца ўвага: у комуне ёсьць больш за сотню галоў чыстага ёркшыра.

Гэтую гісторыю нам коратка расказаў старшыня комуны Дрычыц, стары партыец. Вялікая талоўка была бітком набіта гасьцямі—чырвонаармейцамі, манэўраваўшымі тут, і комунарамі, якія прымалі гасьцей.

Сяўба, убо ка, сіласаваньне—усё гэта ў комуне праводзіцца пры сустрэчных плянах комунараў, з перавыкананьнем іх. Рэалі ацыя пазыкі па заданьні ў 1.000 руб. перавыканана на 1.200 руб. Добра працуюць ячэйка Асоавіяхэму, Аўтодору і МОПР'у.

Комунары з вялікім задавальненьнем прымалі гасьцей—чырвонаармейцаў. Дзяліліся сумеснымі плянамі, абменьваліся гутаркамі аб сваёй рабоце.

— Цяпер мы ўпэўнены, што тэхніка ў нашай Чырвонай арміі магутная—гаварылі камунары.—Баяцца звароту паноў назад ня прыходзіцца...

Вечар зацягнуўся. Чырвонаармейцы-танкісты неахвотна разыходзіліся адпачываць. На другі дзень абыйшлі ўсе пабудовы: канюшню, кароўнікі, сьвінарнікі, сыраварнікі і інш.

— Эх, толькі рабочых рук нед хват—скардзіўся таварыш Лысюк, сакр тар ячэйкі.—Вось, калі хто дэмобілізуецца,—калі ласка, сюды да нас.

Гісторыя комуны, яе посьпехі былі практычнай лябораторыяй для байцоў. У колгасы запісаліся яшчэ тры чалавекі і ў партыю два.

Комунары падарылі Чырвонай арміі добрага верхавога каня.

*Раён манэўраў.*

---

# МЛЫН

**Зьмітро Віталін**

Пракляты млын...
Ён бы вядзьмар
у гэтай белі, гэтай сіні,
калі няма й паміну хмар
і маладзік здаецца стыне...

Ён прытаіўся і прыціх,
ён сочыць нешта і варожыць...
Гэй хто там шэпча ў трысьці?
Хто цягне човен мой парожні?

Хто расьцягнуў навокал ткань?
Хто зьнік у белым пад вярбою?
Гэй-гэй, чыя там галава
ўзьнялася раптам над вадою?!

І зьнік кудысьці маладзік...
А ноч ясьнела і ясьнела...
І выплыў з рэчкі вадзянік
з непараўнальна дзіўным целам...

Наладзіў ён цудоўны баль,
страшэнны баль сабе й русалкам...
Траслася спуджана вярба
ў абоймах жудасных і палкіх.

І здэцца, сьцішылася плынь,
каб рыб латвей русалкам грызьці,
і млын...
Куды-ж падзеўся млын?!.
...— Ты ў ім храпеш і нешта трызьніш...

— Дык гэта сон...
І млын—як млын,
ракоча хвалямі турбіна...

А за вакном—такая глыб
Вады, спакою, стыні і сіні!..

І толькі сумная вярба
трасецца белымі лістамі.
Ёй, мабыць, сьніцца той-жа баль,
дзе кос і цел—ліхая замяць.

Дзе скача злосны вадзянік,
дзе пацалункаў дзікіх плойма,
дзе ўпаў у рэчку маладзік
і зьнік ў русалчыных абоймах...

... І я ўстаў на поўны рост,
Узьняўшы думы з гідкай твані
У век дынам і шасьцярон,
У край вялікі будаваньня.

Манцёр, пусьці другі матор,
ад паравой пусьці машыны!
Хай прабяжыць аж цэлых сто
сто конскіх сіл па гэтай стыні!

Хай закалоціцца спакой,
хай скалатнецца нават месяц
над гэтай ціхаю ракой
ад нашых дзіў, ад нашых песень.

Пусьці-ж, пусьці яшчэ матор,
пусьці матор на ўсе, на сто!..
Мы не дапусьцім нашы сны
трывожыць байкай старыны,

г. Мазыр, 1931 г.

# КРАІНА ПАВІННА ВЕДАЦЬ СВАІХ ГЕРОЯЎ

Зверху, зьлева направа: 1) т. Міленькі — галоўны майстар фабрыкі. Даў рад рацыяналізатарскіх прапаноў. Чл. КП(б)Б. Прэміяван паездкай у Маскву і Ленінград. 2 т. Міклашэўскі—механік фабр. Крупскай. Вынайшоў часальны варштат, які дае 6324 р. эканоміі. Прэміяван 500 рублямі. 3 т. Выхора—завод „Кастрычнік". Зрабіў валікі замест імпортных. Кандыдат КП б Б. Прэміяван 150 руб. 4) т. Шпаноўскі — зав. „Кастрычнік". Яго прапанова па абточцы дае 5000 р. эканоміі. Комсамолец.




5, т. Баркун. Вынайшоў аўтаматычную шпульку. Дае 10000 р. эканоміі. Прэміяван 500 руб.

**6) т. Герцын. Яго вынаходзтва дае 10000 руб. эканоміі. Прэміяван 1000 руб.**

# ДАЦЬ ТЭМПЫ ТОРФАПРАМЫСЛОВАСЬЦІ БССР

Нарыс
Янка Шарахоўскі

## ДОНБАС НА БАЛОТАХ



Было так:
Шумеў на Беларусі лес, калыхаліся дрэвы, гоман верхавін навяваў журбу і смутак. Хадзіў за сахой беларус-селянін і, слухаючы сьпевы лесу, марыў аб лепшай долі. А доля ня ішла, ня было яе, недзе загубілася. Зямлі мала, ды і тая зусім зьнясілена, ня хоча радзіць. Але ня кідаў селянін зямлі, яна яго адзіная радасьць, адна надзея жабрачай гаспадаркі. А побач раскінуліся панскія фальваркі, занялі лепшыя месцы, зачынілі бедняку селяніну ўсе шляхі і дарогі. А тут і свае міраеды хутароў панастанавілі і цягнуць жыцьцёвыя сокі з пакутнага цела бедняка.

Ідзе за сахой селянін, заходзіць да лесу. Шуміць лес, калыхаюцца дрэвы, гоман верхавін навявае журбу і смутак.

А за лесам на мяккіх купінах разьлеглася мохавае балота і ляжыць нібы адпачывае. Пераскакваючы з купіны на купіну, разьбегліся па ім дробныя сасонкі і ў няпэўнасьці спыніліся. Боязна бегчы далей, там пад тонкай карой векавая дрыгва, ступіш неасьцярожна і правалішся.

Шуміць лес, навявае невясёлыя думы, а на балоце цішыня. Таму і слаўся так мякка мох, таму і спавівала сэрца бязьдзейнасьць.

Так было, але больш ня будзе.

Ідуць па полі трактары, падымаюць глебу, адчыняюць ужо колькі вякоў зачыненыя для селяніна шляхі. Яшчэ часам недаесьць ён, часам абшарпаны, але ў сэрцы гарыць надзея, працуе цьвёрда і ўпэўнена на будоўлі новага жыцьця. Працуе ён на фабрыках збожжа і проста ў колгасах, няўпынна ідзе да рабочага, да сьвядомага змаганьня за лепшую будучыню.

Ідуць па полі трактары, даходзяць да лесу. Шуміць лес, калыхаюцца дрэвы, гамоняць верхавіны аб вялікім уздыме.

А за лесам на мяккіх купінах разьляглося мохавае балота. І была на ім ціш і бязьлюдзьдзе. Ад самага нараджэньня спала яно, набіралася моцы, нібы адчувала, што прымусяць яго працаваць.

І вось: на балота прышлі рабочыя — уладары жыцьця. Узьняліся паўскрай балот будынкі, па зялёных імшарах пайшлі фрэзэра, стук машын заглушыў верхавінны гоман. Ад недалёкага заводу па вузкакалейцы прыбег першы цягнік. Сон балота быў парушаны.

Пачалася здабыча торфу.

Многа на Беларусі лясоў, многа і балот. Але расьце і прамысловасьць Беларусі, расьце яе рабочая кляса. Будуюцца ўсё новыя фабрыкі і заводы, уступаюць у строй усё новыя электрастанцыі і ўсе іх трэба забясьпечыць апалам. Няма на Беларусі вугальных басэйнаў, лясы высякаць на апал — не на доўга хопіць. Многа на Беларусі балот, і таму галоўны апалавы рэсурс — торф.

Раскінулі балоты свае ўладаньні на 420 тыс. *га* *) як дамавіты гаспадар, за ўсё свае жыцьцё сабралі вялікія запасы торфу. Прышлі інжынэры вызначаць запасы, вылікі перавялі на колькасьць гатовай продукцыі і атрымалася 12 000 мільёнаў кубамэтраў або 1 200 мільёнаў тон сухога торфу. Запасы вялікія, вялікая крыніца энэргіі і пойдзе яна на соцыялістычныя прадпрыемствы, на ўздым народнай гаспадаркі, на павышэньне жыцьцёвага ўзроўню працоўных

Да 1926 г. было некалькі дробных торфараспрацовак „Зьвязда" ў шклозавода „Комінтэрн", „Ленінскі шлях" у шклозавода „Ільліч" і г. д. З уступленьнем у пэрыод рэконструкцыі роля торфу яшчэ больш павысілася. Былі адкрыты новыя торфазаводы, прадпрыемствы, пачалі пераходзіць на тарфяны апал, каля тарфяных балот пачалі ўзрастаць волаты беларускай індустрыі.

У 1930 г. працоўныя Саюзу ўзналі аб новай перамозе — на Асінаўскіх балотах у строй уступіў Асінстан.

Гудуць правады Асінстану, пабеглі яны праз пал і лясы на фабрыкі і заводы, яго агні палаюць на цэлым шэрагу прадпрыемстваў Воршы, Магілева і інш., яго энэргія прыводзіць у рух тысячы машын.


Асінторф — адна з самых вялікіх торфараспрацовак. Для гэтага досыць сказаць, што па Асінторфу на 1931 г. была запроектавана здабыча ў 100 тыс. тон. Яшчэ большыя маштабы ў торфазавода „Шлях соцыялізму" (проектавалася 120 тыс. тон), які забясьпечвае апалам папяровую фабрыку „Герой працы".

Гудуць правады Асінстану, бяжыць па яго правалох перапрацаваная ў кілёваты цяплынёвая энэргія торфу, перагукваюцца яны з правадамі электрастанцый „Чырвоная Бярэзіна", „Эльводу", Крычаўскай, Бабруйскай і інш., якія таксама працуюць на торфе.

Расьце прамысловасьць БССР, расьце яе рабочая кляса, расьце і торфапрамысловасьць.

На сёньняшні дзень яна ахоплівае дзесяткі прадпрыемстваў амаль усіх галін беларускай прамысловасьці. Торф варушыць колы папяровых фабрык, „Комінтэрн", „Ільліч", торф прадзе ніткі на Віцебскай фабрыцы „Дзьвіна", вяжа панчохі на панчошнай фабрыцы, на трыкатажнай вырабляе трыкатаж, шые гатовае адзеньне на швэйнай фабрыцы імя Дзяржынскага, вырабляе штучны шоўк на шаўковай фабрыцы ў Магілеве ацэтон — на Быхаўскім ацэтонавым заводзе, запалкі — на фабрыках „Дняпро", „Везувій", дае энэргію Дняпроўскай мануфактуры, Аршанскаму комбінату, Гомельскаму заводу, „Чырвоны хэмік" і цэламу раду цэглавых заводаў.

Торф можа скарыстоўвацца ня толькі для апалу.



Ён зьяўл еща добраякасным подсьцілам, добрым угнаеньнем для колектывізаваных палёў. На 1-X—1931 г. на торфараспрацоўках было занята 8.300 рабочых і служачых. Калі ў 1930 г. капіталаўкладаньні па торфапрамысловасьці складалі 2 5 8 тыс. рублеў, то ў 1931 г, яны вырасьлі да 3.0 9 тыс. руб.


У красавіку 1930 г. усе торфараспрацоўкі былі перададзены торфааб'яднаньню. Ужо тады выявілася неадкладная неабходнасьць машынізацыі торфаздабычы, бо саматужныя мэтоды работы, якія ўжываліся да таго часу, вычарпалі сябе і зьявіліся тормазам у падвышэньні продукцыйнасьці працы.

З 1931 г. разгарнулася ўпартае змаганьне за тэхніку, за машынізацыю здабычы торфу. З мэханізаваных мэтодаў найбольш падыходзячымі да беларускіх умоў аказаліся: малы-гідроторф. фрэзэрны, гідра-чарпаковы і багерны. У 1931 г. машынным спосабам па ўсіх відах ужо было здабыта 94 проц. усёй продукцыі, але гэта яшчэ не вырашае проблемы мэханізацыі процэсаў выпрацоўк торфу. Нават больш, на мэханізаваных вучастках работа не стаіць на належнай вышыні. Так па фрэзэрнаму торфу, які здабываўся на гідразаводах: „Грабянёва", „Давыдаўка", „Чырвоная Беларусь". „Асінторф", „Шлях соцыялізму", „1-ае мая", „Комунар" програма 1931 г. выканана толькі на . проц. Па мэтоду малага гідроторфу ішла здабыча на заводах: „Грабянёва", „Шлях соцыялізму", імя Даўмана, „Воля". Програма выканана — на 53.2 проц. Програма здабычы на 1931 г. па ўсіх відах выканана на 53,9 проц.

Торфапрамысловасьць мае вялікія дасягненьні. Першапачатковыя наметкі пяцігодкі ёй перавыкананы. Але гэта не дае ёй права адставаць ад плянавых заданьняў.

Донбас на балотах павінен выраўняць фронт у выкананьні плянаў.

* Па няпоўных даных.







На здымках гідроэлеватарная ўстаноўка (гідроторф) на торфзаводзе „Воля".

фото Лундзіка

# Так нарадзілася помста

Янка Шарахоўскі
эскіз

Каляруе раньне.

Бягуць па полю імклівыя хвалі, паблісквае на сонцы золатам налітае жыта.

Гнуцца каласы да самай зямлі, кладуцца на дарожны пыл, хваля коціцца праз дарогу і зьнікае ў блакітнай далі.

Па дарозе едуць двое маладых сялян, едуць і ціха размаўляюць.

— Бачыш урадзіла,—хмура гаворыць Цімох, спадлоб'я глядзіць на жыта і дадае:

— На нашым пагноі.

Глядзіць на брата Рыгор, у яго тыя-ж самыя думкі і коратка кідае:

— Няхай, не разжывуцца.

Вецер даносіць сокат жняяркі, гукі льлюцца дробненькімі цурочкамі, ды не на радасьць братом гэты гукі.

Бярозаўскія хутары былі знаёмы далёка навокал. Багатая, шчодрая зямля, багатыя гульлівыя гаспадары і ціхія скаргі парабкоў дзесьці ў закутку...

Добра жылі людзі, шчасьліва жылі і ніпачым ім былі людзкія сьлёзы.

І доўга-б яшчэ было гэтак, ды новая сіла прышла на палі, арганізаваў Васіль колгас, раскулачылі бярозаўцаў, а маемасьць аддалі ў колгас.

І ходзіць цяпер жняярка па бярозаўскай зямлі, падразае высокае жыта, а на хутарох жывуць колгасьнікі.

Было вялікае, шумнае гняздо і ня простыя ў ім былі птушкі, а з пароды тых, што перад ноччу вылятаюць на здабычу. І жылі яны без тугі і клапот, адчуваючы сваю моц, весела і бяздумна пілі жыцьцёвую слодыч. Але наляцела бура-навала, раскідала гняздо, і паляцелі засмучоныя драпежнікі супроць сваёй волі ў нязвычайны і далёкі вырай. Засталося толькі двое маладых ды і тых перасялілі ў суседні раён

Не падабаецца ім у суседнім раёне, усё яшчэ думаюць вярнуць былое багацьце і пасяліцца на старым месцы.

Ужо год прайшоў, куды ня езьдзілі, але нічога ня выходзіць.

Была надзея, што разваліцца колгас.

— „Там-жа адны гультаі ды галеча. Ці-ж яны змогуць весьці гаспадарку?“

Ужо год прайшоў, трымаецца колгас, мацнее, набачыліся людзі гора і цьвёрда рашылі не здавацца. Добра вядзе гаспадарку Васіль, не нахваляцца ім колгасьнікі, вясной машыны купілі, цяпер урадзіла жыта—будзе лепш.

Едуць па дарозе бярозаўцы, пабліскавае на сонцы золатам налітае жыта, коцяцца хуткія хвалі.

Нешта новае, моцнае прышло на полі, зруйнавала усе дзедаўскія звычаі, пазбавіла бярозаўцаў гаспадаркі і няма ім месца.

— „Як-жа жыць?“

Хацелі ўступіць у колгас бярозаўцы, прыходзілі на свой стары двор, прасілі, перад старшынёю шапкі здымалі і ўсё дарэмна.

— Нельга,—гаворыць Васіль.

Ходзяць у жняярцы бярозаўскія коні, бярозаўскія каровы даюць колгасьнікам малако, жывуць колгасьнікі ў іхных хатах, а іх ня прымаюць.

Цягне бярозаўцаў на свой стары двор, бачаць, будуюць калгасьнікі новы машынны хлеў, хочацца і ім працаваць разам з усімі і зноў перад імі: Васіль.

Зараз едуць яны ў мястэчка праз былое сваё поле, коцяцца хвалі золатам налітага жыта.

За жытам узьняўся новы машынны хлеў, бялеецца новы гонтавы дах, новае жыцьцё ўступае ў свае правы, і нярадасна ў іх на сэрцы.

Чутней становіцца сокат жняяркі. Рыгор углядаецца ў далеч і глуха гаворыць:

— Васіль.

Глядзіць і Цімох.

Усё бліжай і бліжай жняярка, растуць, павялічваюцца коні. Васіль ужо волатам стаў.

Здаецца ім цягнуцца доўгія рукі, прастор ахапілі, адсунулі поле, зьнікла дарога, бярозаўцам некуды ісьці...

— Васіль уся прычына?

Так нарадзілася помста.

# На баявых пастох

С. Ліхадзіеўскі

Фрэзэр
вырэзвае
рамы.
Ліжуць
нажы
кражы.
Зборшчыкамі,
сталярамі
нам
працаваць і жыць.
Сушыць,
прасуе фанэру
нашая
малодасьць.
Звоняць
настружана нэрвы
тысяча—
мі ладоў.

Вежы ўзводзім на сілас,
мы—
муляры.
муроў.
Водзім команды касілак
на паплавы
ў мурог.
З прагнасьцю
ў напэўнасьць
рушаць к нам
напрасьцяк
крокам
разьмерана-пэўным
несьці
абветраны сьцяг.
Мы гэта—
мільёны,
што забуялі вакол.

Мы гэта—
шыр колёны.
зьмена
бальшавікоў.

Моц наша ў абароне
пільна трымае штых.
Стане яна гарою
перад нападам тых,

тых,
што жыцьцё праелі
за бялізной стала,
тых,
што пілюляй шрапнэлі
хочуць нас
частаваць.

Знаем,—
у іхным тыле,
не на спакой ды на мір,
строй комсамольскіх флётылій
зложвае дынаміт,

Мора няхай ці скалы
сьвет абяззубелы,
знай:
рукі нам
паціскае
амэрыканец—рабочы Свайс.

Гэтага
вам ня скеміць,
год вам няхай па сто,
з намі
ротфронтаўка Эмі
на баявых пастох.

Сіверам
апавіты
ў будаўнічых баёх.
Чырваньню акавіты
сэрца
поўм
сваё.

Масянж—
на твар.
У рукі—
моц.
У шыр, братва,
разгон дамо.

Верасень 1931.



# ХАРКАЎСКІ ТРАКТАРНЫ ЗАВОД

Нарыс
М. Пасьлядовіч

У Харкаве, на вакзале, вычытваем з газэты „Камуніст“: „Учора раніцой першы трактар з маркаю ХТЗ зышоў з конвэера“.

Харкаўскі трактарны завод? Першы трактар? Дзіва. Як яшчэ мала ведаем мы пра нашы дасягненьні...

30 чалавек ударнікаў другой бальшавіцкай вясны і ўборкі ўраджаю *) аж гараць ад нецярплівасьці хутчэй выехаць на гэты хітрун-завод, які нечакана зьбянтэжыў нараджэньнем першага стальнога каня.

— Астаноўка. Новы Харкаў. Трамвай пакуль што далей ня ідзе.

Сьпяшаемся выбрацца з вагону. Аглядваемся: да заводу яшчэ з поўкілёмэтра, а мо' крыху і больш. Але ўжо і адсюль мы дзівімся з ягоных памераў. Дзівімся з вялізных даўжэзных цэхаў—шкло і бэтон, з шматлікіх шасьціпавярховых дамоў рабочага гораду за 15 толькі месяцаў узьнятых энтузыязмам рабочай клясы на пустэчы украінскага стэпу.

І ўжо адсюль чуем гул і грукат вялікага будаўніцтва. Недзе пяюць песьню стальныя пілы, грымяць бляхаю на дахах рабочыя. Блізка ля нас трушчаць цяжкімі малатамі каменьне і залатыя пырскі агня сыплюцца на сухую зямлю.

Усхваляваны літвін Папіртус, ударнік калгасу *Леніна, Аршанскага раёну*, няпрыметна лэпае пальцамі ля вачэй. Неабмежаванае зьдзіўленьне бегае па твары *Эпштэйна з Стара-Дароскага раёну*. Зьбянтэжаны вялікім разгонам работы асьцярожна ступае па бэтоннай, гладкай як шкло дарозе *Размысловіч*.

— Сьмялей—крычыць на Размысловіча адзін з тутэйшых жыхароў, які разам з намі вылез з трамваю.—Цэмэнт зацьвярдзеў і па ім хутка пойдуць лёгкаю хадою цяжкія аўтамабілі.

Гэта найноўшая істужка дарогі злучае новы Харкаў са старым. Адсюль да цэнтру украінскай сталіцы 12 кілёмэтраў.

Ідзем да канторы будаўніцтва. Спыніліся ля вялізнага будынку. І покуль кіраўнікі нашай экскурсіі стараюцца ў дырэкцыі аб прапусках, мы прагнымі вачыма бегаем ад аднаго волата цэху да другога. Яны яшчэ ня ўсе агалены ад рыштаваньняў. На ўсёй вялізарнай плошчы, якую заняў завод, кіпіць работа: бэтоншчыкі, муляры, землякопы, цесьляры, шкляры і бляхары—сотні, тысячы смуглявых рабочых—старых—з барадамі і маладых—з задорлівым бляскам вачэй—стараюцца, каб хутчэй поўным ходам пайшоў завод, каб пяцьдзесят тысяч трактараў штогод даваў саўгасам і калгасам шаснаццацітысячны калектыў.

— Пяцьдзесят тысяч трактароў? За год?—недаверліва перапытвае Эпштэйн у рабочага, які сказаў нам гэтую навіну.

— Так, так. Пяцьдзесят тысяч. Ужо сёлета да пачатку новага году трэба выпушчаць ня менш, як па 125 трактараў за дзень. Учора выпусьцілі першы спробны трактар „Інтэрнацыянал“. Цяпер разгортваецца змаганьне за неадкладны масавы выраб машын. Гэты завод яшчэ больш магутны, як Сталінградзкі трактарны, той вырабляе толькі па 40 тысяч „інтэраў“ за год.

У яго ваччу вялікая радасьць, калі кажа пра гэтае. Здаецца вось ён кіне ганарлівыя словы, што сталінградзкаму трактарнаму далёка да іх волату. Але, не. Чуеце: ён толькі пытае, ці няма каго з Гомелю, бо сам ён гомельчанін і ўжо два гады, як ня быў у БССР, ня было часу зьезьдзіць...

Пасьля, калі мы вандравалі па цэхах, між гор скрынак з абсталяваньнем—нас пыталі: „ці не з Уралу мы? Можа хто з Новасібірска? Ці няма таварышоў з Карэліі?“

...Гмахі гэтых волатаў-цэхаў аднаго з „518“, новы, сацыялістычны горад—цэмантаваліся энтузыязмам вольнае працы рабочых і працоўных сялян усёй краіны Саветаў.

Але чаго так нясмела хавае свае вочы таварыш Эпштэйн? Чаму клопатныя маршчыны цьмяняць твар высокага Папіртуса?

Ужо падыходзіць да нас з прапускамі. Сакратар парт'ячэйкі ліцэйнага цэху, сярэдняга росту яшчэ малады рабочы ў касьцюме юнгштурму вызваўся быць нашым груп водам.

Ліцэйны цэх... У даўжэзным пад'язным тунэлі высока-высока над нашымі галавамі грукочуць малаткамі. Там рабочыя сьпешна заканчваюць пракладку рэек для пад'ёмнага крану. Унізе таксама рэйкі—для ўваходу сюды, унутр цэху, нагружанага цягніка. Ён увесь тут зьмесьціцца. Ён падвязе сюды фармовачны пясок, падвязе чыгун і сталь, каб пасьля пакорліва падставіць прасторную сьпіну плятформаў пад сотні новенькіх „Інтэрнацыяналаў“ і паімчаць іх на сацыялістычныя палі.

Сотні новенькіх замежных варштатаў. Сотні новых рабочых прышлі сюды з калгасаў вывучаць ад кіраўніцтвам вопытных старых рабочых тэхніку вырабу стальных коняй. Гэта было месяц, два таму назад. Сёньня яны ўжо спраўна і спрытна напаўняюць жалезныя формы пяском, выбіваюць у ім месца для выплаўкі розных дэталяў і ёмка ставяць на паслужлівы конвэер. З сканца ідуць вагончыкі туды, дзе адліваецца мэталь. Расплалёны ў печы, ён смагне разыйціся бурлівым морам агню, але, абняты непадатнаю зямлёю, толькі працяжна ўздыхае і стыне холадам ад непасільнай злосьці...

Тады спэцыяльнае прымудраваньне абарочвае форму з вагончыка (а хада канвэера ня спыняецца) на спэцыяльнае вялізнае сіта. Пясок праз шчыліны прасейваецца ўніз, а вылітыя

*) Паездка была арганізавана ў выніку конкурсу „Калгасьніка Беларусі“ на лепшае правядзеньне сяўбы і ўборкі ўраджаю па МТС, саўгасах і калгасах.

дэталі мэханічна перадаюцца на другі канвэер, каб пасьля абчы ткі і абточкі ў абручным цэху прырашчваццна да карцару і сыходзіць з вялікага канвэера гатовай машынай.

Усё тут па удавана і прымудравана так, каб пры найменьшай трапе сілы рабочага даваў найбольшую продукцыйнасьць працы. Самыя найноўшыя машыны і прылады ўстаноўлены для найвышэйшай мэханізацыі працэсаў работы. Электракары, мат рныя цялежкі, пасл мяныя розуму і рукам чалавека снуюць з ад аго ў другі цэх. Ледзь чутна шуршаць аб падлогу іх гумовыя ады.

Малады у шэрым адзеньні чалавек, сустракае нас вясёлай усьмешкай ля кавальскага цэху.

— Інжынэр.—паведамляе нас групавод.—Канчае тут мантаж малатоў і награвальных печаў. Ён вам лепш растлумачыць, чым я.

О, ён можа гаварыць, гэты інжынэр. Хоць мы ўжо і да яго даведаліся, што волат-кавальскі цэх пачаў расьці толькі з вясны гэтага году. Цяпер замест пустэчы мы бачым скончаную пабудову. Ярка гарaць пад сонцам сьце ы са шкла і бэтона. Гулкі дрыжыць зямл ад удараў малатоў.

Заходзім у цэх. Доўгі, доўгі рад мэханічных малатоў ро ных памераў: я ы грузна аселі на падлозе. У кавальскім цэху шмат ужо машын, якія вырабляліся на нашых заводах: малаты, награвальныя печы.

— І ня горш за тыя, што ўвозім з-за мяжы. А гляньце на печы: гэты рад — увезеныя, а тыя — нашы. Дык, што вы думаеце: чые выйшлі лепшы?

Інжынэр дапытна аглядае кожнага экскурсанта, чакаючы адказу. Потым на ыходзіць да аднае махіны і як бацька лашчыць дзіця, праводзіць рукою па жалезнай абшыўцы.

— Гэта печ і ўвесь гэты рад іх пабудаваны на савецкіх заводах. На якасьці не падалуцца замежным, а продукцыйнасьць іх — у два разы боль ая.

Далей ідзе тлумачэньне тэхнічных процэсаў работы. Сюды пастуnае рознай грубіні і даўжыні сталь. Брускі гэтай сталі загр жаюцца ў печы, каб праз колькі часу расплавіцца ад агню нафты. Тады гэтая ст ль будзе паслухмяна фармавацца пад няшчаднымі ўдарамі штамповачных малатоў у каленчатыя валы, шатуны і процьму іншых трактарных дэталяў. Канвэер, электракары пацягнуць іх у мэханічна-зборачны цэх. І там дзе вялікі канвэер зьнікае пад жалезнаю пласьцінаю падлогі, дэталі ажывуць і загрукочуць маторам.

Цяпер у нас ідзе заядлае асваеньне рабочымі дэталяў трактара. Гэта значыць, кожны вывучае, як тую ці іншую частку зрабіць, як і куды яе прымацоўваць, каб вышла машына. Разам з будаўніцтвам заводу праводзіцца падрыхтоўка кадраў. Цяжка, але нічога. Завод разгарне работу з першага кастрычніка гэтага году. Ударнікі забясьпечаць выпуск 50-ці тысяч трактараў за год.

*Рабочы пасёлак*... якое малое падабенства з пасёлкам. Гэта горад, новы горад, так непадобны на цесныя і крывыя вуліцы ст рых гарадоў.

За 15 месяцаў вырас ён, *Новы Харкаў*, як і сам трактарны волат—зав д па пустэчы стэпу. 28 чатырохпавярховых дамоў, 8 шасьціпавярховых—абудаваны на асобных пляцоўках кожны. Вакол кожнага дому будуць цьвісьці ўлетку расаднікі кветак і сонечнага сьвятла, ласкавага цёплага ветру—не загародзіць аднаму дому другі сусед—дом.

8 шасьціпавярховых дамоў будуць займаць адзінокія рабочыя. 28 чатырохпавярховых—сямейныя. На кожную сям'ю адводзіцца два пакоі. Пры кожным пакоі—ванна і прыбіральная. У любы час дня і ночы ванна забясьпечана халоднай і цёплай вадою. Усе кватэры апяпляюцца і забясьпечваюцца вадою ад цэнтральнай электрацэнтралі. Кухні ў дамох няма ніводнай. Усе рабочыя і іх сем'і будуць харчавацца ў сталоўках, якія будуць працаваць кругла суткі. Пры сталоўках арганізуюцца бібліятэкі, чытальні, пакоі адпачынку, розныя гурткі. На кожныя тры тысячы чалавек у гэтым новым горадзе арганізуюцца мэханічныя пральні.

Будуецца клюб на 2 тысячы чалавак, кінотэатр на тысячу 200 чалавек. Свая тэлефонная станцыя на 3 тысячы абанэнтаў, свае магазыны, цырульні, крэматорый, бальніцы, школы—усё гэта будзе пры трактарным, у новым рабочым горадзе.

Як гэта ўсё непадобна на тыя заводы, на тыя цёмныя і цесныя казармы якія будавалі капіталістыя. Тут, у новым, соцыялістычным горадзе ўсё зроблена так, каб забясьпечыць рабочаму найлепшы адпачынак і культурнае разьвіцьцё.

# БДТ2 ПЕРАД НОВЫМ СЭЗОНАМ

Пасьля сканчэньня сэзону 1930-31 году ў Менску БДТ2 выехаў, п водле запрашэньня стар ыні Галоўмастацтва РСФСР Фелі са Кона, у гастрольнае падарожжа Масква-Ленінград. Гастролі БДТ2 у абодвух пролетарскіх цэнтрах СССР прайшлі з н дзвыча ным посьпехам. Маскоўскаму гледачу БДТ2 паказаў у памяшканьні МХАТ (Пляц Сьвярдлова) спэктаклі „Качагары" і „На прадвесьні" (апошняя п'еса б ла тэатрам перад паездкай зн чна перароблена і выпраўлена). У Ленінградзе тэатр працаваў у Выбарскім і Маскоўска Нарскім палацах Культуры. Ён паказаў там пастаноўкі „Качагары", „Першая конная", „На прадвесьні" і „Разлом".

У вольны час тэатр праводзіў культвылазкі на буйныя прадпрыемствы і ў Чырвоную армію з канцэртным рэпэртуарам, загадзя падрыхтаваным яшчэ ў Менску. За праробленую працу па культабслугоўваньні рабочых мас, **БДТ2 атрымаў ад дзяржаўнага судабудаўнічага заводу імя Марці ў Ленінградзе ганаровы а рас.** Таксама калектыў тэатру атрымаў **адрас і ад рабочых Бел-ДРЭС імя Сталіна**, з якімі ён правёў разам сьвяткаваньне 11-й гадавіны вызвал ньня Беларусі **ад польскай акупацыі.**

Гастролі ў Маскве і Ленінградзе былі тэатрам выкарыстаны ў мэтах узьняцьця культур ага ўзроўню свайго скла у. Праводзіліся арганізава ыя экску сіі ў музэі, на прадпрыемствы і ў гістарычныя ваколіцы Ленінграду. Між іншым БДТ2 даў у Ленінградзе **паказ і канцэрт для лепшых ударнікаў СССР**, прэміяваных паездкаю **на цеплаходзе „Украіна" вакол Эўропы**, і прыняў удзеў у іх провадах.

У апошні раз БДТ2 сустрэўся з ударнікамі ў Фінскай затоцы, калі акторы вярталіся ў Ленінград на параходзе з Пецяргофу. Насустрач плыў цеплаход „Украіна", які олькі што вы аў з Ленінградзкага порту. Ударнікі, што стаялі на палубе цеплаходу, пракрычалі параходу з акторамі ў апошняе р зьвітаньня: „Няхай жыв савецкая краіна". Параход адказаў друж ым „ура".

Паездка на гастролі, вопыт непасрэднай сувязі з пролетарскім гледачом Масквы і Ленінграду прынесьлі для БДТ2 бязумоўную **карысьць, бо садзейнічалі павышэньню культурнага і політычнага ўзроўню калектыву і ўзбагацілі** тэатр організацыйным вопыт м. Гэты першы выезд тэатру за межы БССР прашоў пасьпяхова з матар'яльнага боку; гастролі былі пр ведзены без датацыі, выключна на гаспадарчым разьліку і далі тэатру пэўны прыбытак.

24 кастрычніка г. г. у Гомелі, у толькі што адбудаваным клюбе чыгуначнікаў імя Леніна, адбылося ўрачыстае адчыненьне 6-га сэзону тэатру. Пасьля адчыненьня сэзону паказам „Качагары" БДТ2 прыступіў да афармлень я сваёй чарговай прэм'еры—**п'есы А. Александровіча „Напор"**. П'еса напісана ў вершах і прысьвечана выяўленьню ролі камсамола а вытворчасьці. **Гэту сваю працу БДТ2 прысьвячае Ленінскаму камсамолу Беларусі.**

Для мастацкага афармленьня пастаноўкі БДТ2 запрошаны з Масквы вядомы маста **Кісялёў** (афармляў „Рэвізора" у тэатры Мэйерхольда). Рэжысэрская праца над пастаноўкай даручана **М. Міцкевічу.** Пасьля пастаноўкі „Напора" тэатр мяркуе працаваць на п'есай **„Вайна да пабеднага канца" Якуба Коласа** і **„Амэрыка"** (назва ўмоўная) **В. Сташэўскага.** Для БДТ2 піша такс ма п'есу па заказу тэатра **Р. Кобец** на тэму: **нараджэньне новага чалавека ў умовах новага грамадзкага ладу.** У Гомелі БДТ2 мяркуе адсьвяткаваць **5 цігадовы юбілей існаваньня** тэатру і 10-ці гадовы са дню стварэньня студыі.

У сэзоне 1931-32 г. БДТ2 ставіць перад сабой вырашэньне наступных задач:

1. Стварэньне беларускага пролетарскага орыгінальнага рэпэртуару.
2. Праца над афармленьнем і выяўленьнем свайго самастойнага і ўласьцівага для БДТ2 творчага стылю, карыстаючыся мэтадам дыялектычнага матэрыялізму.
3. Падрыхтоўка і ўсебаковае выхаваньне новых кадраў.
4. Тэхнічная рэканструкцыя тэатру.

Уся праца, усе творчыя сілы калектыву БДТ2 у бягучым сэзоне будуць накіраваны на пасьпяховае вырашэньне гэтых асноўных, сьвядома пастаўленых перад сабою тэатрам задач.

В. Вольскі.

# МАКСІМ ЛУЖАНІН

# ЗВАРОТ ДА РОМЭН РОЛЯНА І БЭРНАРДА ШОУ

Беларусь!
Першы раз пачуеце,
Хоць вялікім шляхам ішлі,
можа гэта
крыху расчуліць вас,
Што ня чулі,
а век зжылі.

Гэта, знаеце,
на ўскраіне,
Каля самай польскай мяжы.
Негарэлае—
там паўстанак ёсьць,
Скуль кур'ерскі
да вас бяжыць.

Шмат вякоў
была спраняверана,—
Не дарма-ж у поэтаў слынь:
„Пад пятою
Расійскай імпэры
Расьцьвітае толькі палын".

Ня цьвіла.
Так жыла калюшкаю
Мову тулячы да грудзей,
Нават,
ветры яе ня гушкалі,
Ня ўзыходзіў над ёю дзень.

пасьля,
укаршэніўшы пана—
чорнасоценцаў, кулакоў—
абазвалася Асінстанамі.
Звонкай
музыкай
гарадоў.

І рукою, усё тэю-ж самаю,
што трымае
клянец і рычаг,
разьвінула
свой ясны ранак яна,
Падужэўшы
у грудзях, у плячах.

У палёх—
ураджайнымі звонамі,
Чорным золатам
з грузкіх балот,
Наліванаю медзьдзю антонавак—
Свой зьбірае яна ўмалот.

Што ня слухалі—
намагнічілі,
Каб вышэй яе ўздымаць—
Мэталісты
напружанага Віцебску,
Поруч—
Добруш
і Гомельмаш.

Окупацый забіўшы шчыліны,
Узяліся яшчэ жвавей
Нават, шоўк
мы рабіць навучыліся,
А ў анучах хадзілі век.

Так...
былі, праўда, аскабалкі.
Каб цяжэй нам—
на шлях пясок.
Дзе-ж вы бачылі,
каб бяз палкі
Шлях праехала калясо?!

Тут такое пашло ўпорай,
перш дык піхенька:
„Ква-ды-ква...
Мы ізноў пад маскоўскім ботам,
Што такое для нас Масква".

А пасьля —паказалі зубы.
Давялося іх—
па вусах,
Нам дык есьці
патрэбны зубы,
Ім патрэбны былі—
кусаць.

Бо пад тэй
незалежнай пагудкаю
Паказаўся
вясёлы твар:
Перш паваксіць
халяўку Пілсудзкаму,
а пасьля яе
цалаваць.

Разумееце,
ім хацелася,
атрымаўшы замежны дыплём,
Каб гарэла
ізноў Негарэлае,
Каб сухое
балотам было.

Але мы
здабылі месца,
Каб ніколі не аддаваць.



МАКСІМ ЛУЖАНІН

Роўна
дужай крывёю б'ецца
Сэрца сьвету ўсяго—
Масква.
Мы спаветрым замахі навалы,
Пад чырвоным штандарам
Крэмля.
Там-жа
Леніна сэрца палала,
Там-жа—
Сталіна воля расла.

Сонца!
Словы мае гарачэй кінь
У гэты волатаўскі разьбег,
Сакратар
беларускай ячэйкі—
Просты провад
ЦК УсеКП.

Гэта знаеце, пэўна, самі,
Дарагія нашы сябры.
Я-ж—сьпяшаюся за часамі
Замарудзіў
пра колёрыт.

Можна сплесьці якую небыль
Пра асеньні смутак палян.
Сьмешнавата
цяпер пра неба,
Цікаўней мая рэч—зямля.
Заўжды кветласьці сэрцу трэба.
Прыяжджайце!
Будзеце—госьці!
Малака ў нас хапае,
хлеба—
І з прыгоршчы поэтаў ёсьць.

# ЛІТАРАТУРНЫ СІЛУЭТ

# МАКСІМ ЛУЖАНІН

*ГУМАРЭСКА*

У 1925 годзе ў Менску на літаратурнай старонцы „Савецкай Беларусі“ нарадзіўся паэта Максім Лужанін.

Да 1925 года Максім Лужанін быў не Максім Лужанін.

Да 1925 года замест Максіма Лужаніна жыў Алесь Каратай—добры малады хлапчук.

У 1925-ым годзе добры малады хлапчук наважыў стаць паэтам.

Раней чым стаць паэтам гэты малады хлапчук сур'ёзна задумаўся над тым, што трэба для гэтага маладога чалавека для таго, каб стаць паэтам.

З гісторыі літаратуры Алесь Каратай ведаў, што Луцэвіч як стаў паэтай падпісваецца Янкай Купалай, Міцкевіч—Якубам Коласам, Кудзелька—Чаротам.

Задумаўшыся над гэтым фактам, Алесь Каратай рашыў, што першае, што трэба для таго, каб стаць сапраўдным паэтай—гэта грунтоўна зьмяніць сваё прозьвішча.

Пасьля гэтага неўзабаве прозьвішча Каратай было зьменена на Лужанін.

З імем было цяжэй.

Алесь—добрае імя.

Але чым маладосьць не ахвяруе ў імя літаратуры...

Алесь стаў Максімам.

Пасьля таго, як Алесь Каратай стаў Максімам Лужаніным, галоўнае было праароблена.

Наперадзе заставаліся дробязі,—

складаньне там розных вершаў ды паэм.

Але што гэта значыць для паэта, калі імя ў яго ўжо ёсьць?

... І трэба сказаць, што з імем Максіму Лужаніну пашанцавала.

Я вунь ведаю некаторых другіх паэтаў, то яны і псэўдонімы прыдбалі і потым зноў іх на свае сапраўдныя прозьвішчы перамянілі, і потым зноў сапраўдныя прозьвішчы на псэўдонімы зьмянілі і псэўдонімы гэтыя ўжо зусім састарыліся, а няшчасныя людзі, што хаваюцца пад гэтымі псэўдонімамі,—усё яшчэ ня сталі паэтамі. Мабыць, таму, што нядобрыя псэўдонімы абралі, бо іначай дык гэта самы пэўны шлях да таго, каб стаць славутым пісьменьнікам.

Цяпер я падрабязна апішу, які з сябе Максім Лужанін.

— Вы ведаеце, таварышы—Крапіву?

Дык вось Максім Лужанін і Крапіва і ў жыцьці і ў творчасьці надзвычай падобны адзін да аднаго.

За выключэньнем хіба таго, што Крапіва высокага росту, а Максім Лужанін не,—Крапіва піша байкі, а Максім не,—але затое Максім піша вершы а Крапіва не...

... Так што адно на адно і выходзіць...

Стала вучыцца Максім Лужанін дужа ня любіў, таму ён, каб як мага хутчэй, сямёхгодку скончыў за чатыры гады.

Улетку рыхтаваўся і скакаў праз клясу.

Другія яго аднагодкі, дык яшчэ і цяпер сядзяць у сямёхгодцы.

Не сьпяшаюцца людзі...

Вучацца...

У 1924-ым годзе Максім Лужанін паступіў у белпэдтэхнікум.

Там—Паўлюк Трус, Глебка,—Андрэй Аляксандровіч—на старшыню Менскай Асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў вучацца.

У тэхнікуме Максім Лужанін зарабіў за вершы 15 (пятнаццаць) рублёў.

Неўзабаве скінулі са стыпэндыі.

— Іш ты яго, ажуць, Рокфэлер. Залез у белпэдтэхнікум, ды яшчэ і 15 рублёў у месяц стыпэндыі вымагае...

... Яшчэ і да гэтага часу Максім Лужанін з павагаю адгукаецца аб тагачаснай адміністрацыі тэхнікума.

— Дзякаваць, кажа, ім, што зусім яшчэ ня выкінулі з тэхнікума. Сам, кажа, я чалав к сьвядомы... Разумею, што Ротшыльдам ня месца ў тэхнікуме

У 1928-м годзе Лужанін скончыў тэхнікум і падаўся ў Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт. .

. . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Я ўжо зазначыў, што Максіму Лужаніну пашчасьціла з выбарам псэўдоніму. Яго кнігі „Кастрычнікам, ліпенем, маем“, „Аднагалосна“ ды іншыя — эмоцыянальныя і бясспрэчна таленавітыя.

Памылкі, як'я былі ў Лужаніна, ён здолеў шчыра прызнаць і сумленна выправіць іх у сваёй далейшай творчай працы.

Вось чаму, няхай і надалей у паэты:

— „З перамогаю новых дамб
Вырастае ў песьню ямб“.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . .

З цягам часу Лужанін адчуў смагу і да навукі, ва унівэрсытэце ўжо ня скача штогод праз клясу, як той хлапчук у сямёхгодцы, а здаецца ўжо 3-ці год узапар вывучае нешта на 2-м курсе.

— Лепей, кажа, менш,—ды лепей.

... Так што асьвету Максіма Лужаніна можна лічыць ужо канчаткова як „недакончаную вышэйшую“.

**Алёша.**

М. СЬЦЕЛЬМАШУК

# НА МАСТУ

Гадзіны капаюць
З гальчатай, белай вежы,
Гудзіць па вуліцы
Надрывіста аўто.
Сталёвыя гудкі
Калышуць ранак сьвежы,
Барвовы дзень
Далізывае ток.
І горад устаў,—
Зарой зазьзяў і рынуў,—
На працы фронт
Мільён мазольных рук.
Капэрацыйныя
Адкрыліся вітрыны,
І загрымеў
Прывычна шэры брук.
Там з цэрквы сівае
Зьбіваюць дружна купал
Тут элеватар,
Волат ўжо узрос,
Куды ні глянь
Каменьня і жвіру кучы,
Ў іх звоне гулкім
Чуецца наш рост.
І толькі год,
І вершы не пазнаць мне,
О, колькі новага
Цалуюць вочы зноў.
Там рэйкі звонкія
Ў разьбегу палынеюць,
Тут жоўты мост
Падпяразаў Дняпро.
Стаю, гляджу
Як хвалі лагараюць
І як штурмуюць
Пенай берагі.
О, Беларусь!
Мая ты дарагая,
Ты ў СССР
Складаеш працы гімн.

Узводзіш ты
Фабрычных труб колёны,
Красуеш ты
Загарам новых сьцен.
Эўропа старая
Блукае ў змроку чорным.
Ня зьнішчыць нас,—
Мы кожны дзень расьцем.
Расьцем!
І рост наш ў пераможных
тэмпах.
Працоўных рук
Зьвініць жалезны сеў
Пад кіраўніцтвам
Ленінскай, вялікай
Сталёвай волі УсеКП.
Гадзіны капаюць
З гальчатай, белай вежы,
Гудзіць па вуліцы
Надрывіста аўто,
Сталёвыя гудкі
Калышуць ранак сьвежы,
Барвовы дзень далізывае
ток.

г. Ворша
12-IX 1931 г.

# Па Чырвонай Беларусі


Фото САЛАВЕЙЧЫКА




Брыгада Дворкіна, якая дала сусьветны рэкорд па кладцы цэглы.



Дэмонстрацыя менскіх фізкультурнікаў супроць забароны спартакіяды ў Нямеччыне.



Брыгада Дворкіна за работай.





Раздача прызоў на спаборніцтвах Беларускай вайсковай акругі.

# БІБЛІОГРАФІЯ

## За разгортваньне социялістычнай жывёлагадоўлі ў БССР

**1. Б. Наумаў.** Гадоўля і выкарм цялят. БДВ, 1931, тыраж 10000, цана 15 к.

**2. І. Арлоўскі.** Організацыя групавога кармленьня кароў у социялістычных гаспадарках. БДВ, 1931, тыр. 10000, ц. 12 к.

**3. Т. Тавілдарава.** Племянны бык. БДВ 1931, тыраж 5000, ц. 23 кап.

У кніжцы **Наумава** разьбіраецца адно з галоўных пытаньняў сельскай гаспадаркі—**вырошчваньне маладняку.**

Аўтар мовай зразумелай для шырокіх колаў калгасьнікаў правільна піша, што нам трэба „гадаваць як магчыма больш цялят на племя. Трэба адбіраць цялят ад кароў лепшых па ўдоях і ад добрых па паходжаньні быкоў".

Асаблівую ўвагу зьвяртаць на выбар бычкоў, бо іх звычайна гадуецца менш (на 25 30 цялушак 1 бычок).

Правільна аўтар падкрэсьлівае аб контрактацыі ўсяго племяннога маладняку, аб контрактацыі маладняку на выкарм. Забойства маладняку ў раньнім узросьце забаронена законам. Маладняк выкарыстоўвае ў 1½ разы выгадней корм на мяса, чым дарослая жывёла, дзякуючы чаму атрымоўваецца больш мяса.

Асабліва патрэбна організоўваць для вырошчваньня маладняку колектыўныя цялятнікі ў колгасах, у якіх справа будзе пастаўлена лепей і танней. Маладняк неплемянны патрэбна адкармліваць на мяса ў працягу 2—3 год.

Пытаньням як правільна карміць, выпойваць, даглядаць, утрымоўваць, колькі корму патрэбна для цялят, у кніжцы адводзіцца значнае месца. Зусім варта аўтар падкрэсьлівае ролю пашы, колектыўнага выпасу, падкормкі і г. д.

У заключэньне аўтарам даецца апісаньне галоўнейшых хвароб цялят і як іх лячыць (белая і звычайная вольнасьць, запор, уздуцьце жывату, малочніца). Дадаецца табліца азначэньня жывое вагі цялят і табліца расійскіх кармовых адзінак з бялком ў 1 *кг* корму. Кніжка заслугоўвае шырока распаўсюджаньня.

Кніжка **Арлоўскага** заслугоўвае шырокае ўвагі тэхнікаўжывёлаводаў і скотнікаў-тэхнікаў.

Яна тавіць задачу „набыць веды па організацыі групавога кармленьня кароў у саўгасах і колгасах". Аўтар агаварваецца, што апісаны прынцып **разьлічаны толькі на пераходны пэрыод** (падкрэсьлена аўтарам), да поўнай мэханізацыі і электрыфікацыі ўсіх процэсаў абслугоўваньня скаціны ў саўгасах і колгасах.

Кніжка будзе цікавай для студэнтаў с-г тэхнікумаў і ВНУ пры праходжаньні вытворчай вучэбнай практыкі. У кніжцы ёсьць такія разьдзелы: даныя, патрэбныя для складаньня рацыёнаў, складаньне табліцы № 4 і разьбіўка кароў на групы, вылічэньне неабходнай колькасьці кармовых адзінак і бялкоў на групу кароў, патрабаваньні да рацыёну, які складаецца, самае яго складаньне, організацыя працы пры групавым кармленьні, разьмеркаваньне кармоў і аб таблічках у аборы. Даюцца ў канцы дзьве табліцы для складаньня кармовых норм і расійскіх кармовых адзінак.

Пераход ад індывідуальнага кармленьня да групавога зьберажэ многія тысячы тон корму па рэспубліцы, вылічэньне на групу з'экономіць працу па вылічэньні кармоў, панізіць сабекошт адзінкі таварнай продукцыі і г. д.

„Масавае атрыманьне малочных продуктаў пры магчыма нізкім іх сабекошце, належная якасьць продукта, мэтазгоднае скарыстаньне малочнай машыны—гэтыя мэты могуць быць дасягнуты толькі пры групавым кармленьні"—кажа аўтар ва ўступе да сваёй кніжкі.

Вопыт групавога кармленьня аўтар правёў па Барысаўшчыне яшчэ ў 1928 г. у саўгасе Весялове, дзе меў добрыя вынікі. Недахопам групавога кармленьня зьяўляецца тое, што пры ім ня ўлічваюцца вузка індывідуальныя асаблівасьці тэй ці іншай каровы. Пытаньне, высунутае аўтарам, зьяўляецца новым і яго неабходна ўнесьці ў практыку буйных саўгасаў і колгасаў.

Недахопам кніжкі зьяўляецца тое, што няма нормы выпрацоўкі, няма нічога аб зьдзельшчыне. БДВ патрэбна хутчэй надрукаваць тыя прыкладныя нормы, якія зараз распрацоўваюцца ў НКЗ і Белколгасцэнтру для жывёлаводчых гаспадарак (для сьвінаводчых друкуюцца).

Трэцяя кніжка Тавілдаравай „Племянны бык" патрэбна для ўсіх тых саўгасаў і колгасаў, дзе маюцца племянныя быкі.

Аўтар піша пра значэньне вытворніка, мэтоды расплоду выбар быка па знадворнаму выгляду, па радаслоўнай, аб выпрабаваньні быкоў, скарыстаньні іх. Далей аўтар расказвае аб гадоўлі, кармленьні ў маладым узросьце і дарослых быкоў, **штучным запладненьні**, што набывае асабліва вялікае значэньне ў нашых буйных саўгасах і колгасах, бо там маецца вялі і недахоп у племяннай жывёле, асабліва ў быкох вытворніках.

**Т. Ляўша.**

**Я. Іоселеў „Прараканьне надвор'я і яго значэньне ў социялістычным будаўніцтве"** (Менск, 1931, ДВБ, тыраж 20000, цана 4 к.).

Брошура популярна расказвае аб практычным значэньні прараканьня надвор'я, ад чаго надвор'е залежыць, на чым грунтуецца выкарыстаньне яго ў социялістычным будаўніцтве.

Аўтар правільна ўказвае, што па прыметах нельга правільна праракаць надвор'е, а трэба карыстацца тым паведамленьнем, якое перадаецца па радыё ад Бюро надвор'я Гідромэтэоролёгічнага інстытуту штодзенна ў 17 гадз. 30 хв. на наступны дзень.

Апрача штодзеннай перадачы, некалькі раз у год паведамляецца аб надвор'і, якое чакаецца ў надыходзячым сэзоне—пахаладненьне, пачатак замаразкаў, вялікія марозы, пачатак вясны, дажджлівая пагода і г. д.

Да брошуры дадаецца карта Беларусі, якая падзелена для прараканьня надвор'я на 8 частак і тлумачэньні да спэцыяльных тэрмінаў, якімі карыстаюцца ў прараканьні надвор'я.

Кніжка заслугоўвае таго, каб яна была ў кожным саўгасе, колгасе, МТС, у кожнай фабрыцы і заводзе, у кожным прадпрыемстве і г. д.

**Т. Ляўша.**

**М. Ільін**—Сто тысяч чаму (пераклад з расійскае мовы) БДВ, Менск, 1931 г., 80 стар. Цана 35 кап.

Людзі ведаюць, калі і кім вынайдзены тэлефон, электрычная лямпка, а спытайцеся ў іх, ці даўно прыдумана люстэрка, насоўка, ці даўно пачалі мыцца мылам, есьці бульбу. На гэта мала хто адкажа. Мы з захапленьнем чытаем пра вандраваньні па далёкіх, недасьледаваных краінах і не дагадваемся, што ў двух кроках ад нас, ці нават яшчэ бліжэй, знаходзіцца незнаёмая, дзіўная, загадкавая краіна, якая называецца... наш пакой. Аўтар вядзе чытача па пакою і паказвае колькі новага і незнаёмага хаваецца ў вадаправодным кране, печцы, стале, пліце, паліцы з рондлямі, буфэце. Ён паказвае нам добра вядомыя рэчы якія атуляюць нас у жыцьці, але паказвае іх зусім з новага боку

Кніжка з цікавасьцю будзе прачытана ня толькі дзецьмі, за цікавіць яна і дарослых.

**Л. Якаўлеў** — Заходняя Беларусь, БДВ, Менск, 1931 г. 88 стар. Цана 35 кап.

**Д. Боген**—Заходняя Беларусь пад крывавым бізуном польскіх окупантаў. БДВ, Менск, 1931 г. 16 стар. Цана 3 кап.

У Савецкім Саюзе, у Савецкай Беларусі ў прыватнасьці, мы маем рост, разьвіцьцё ўсіх элемэнтаў народнае гаспадаркі і культуры. Але ёсьць другая Беларусь—Беларусь Заходняя, якая знаходзіцца пад пятой польскага фашызму. Крызіс, які ахапіў увесь капіталістычны сьвет, праяўляецца і ў Зах. Беларусі. Гэты крызіс прывёў да значнага паго шаньня і без таго цяжкога становішча рабочых і сялян З. Б., паглыбляючы ўбоства і голад шырокіх мас працоўных.

Брошуры Якаўлева і Богена даюць нашаму чытачу надзвычай добрае ўяўленьне аб жыцьці і цяжкіх пакутах працоўных З. Б. Яны асьвятляюць становішча прамысловасьці і сельскай гаспадаркі З. Б., нацыянальны ўціск і нацыянальна-вызваленчы рух, рэволюцыйную барацьбу рабочых і сялян; паказваюць героічнае змаганьне КП(б)ЗБ—правадыра і організатара пролетарыяту і працоўнага сялянства ЗБ.

**А. Туранкоў.**—Песьні будаўніцтва. БДВ, Менск, 1931 г. 14 стар. Цана 30 кап.

Зборнік А. Туранкова зьмяшчае шэсьць масавых песень з нотамі на два галасы. У зборніку зьмешчаны творы на словы А. Александровіча („Дагнаць, перагнаць" і „Сасна") Ц. Гартнага („Песьня ўдарнікаў"), Ул. Хадыкі („Расьцем і дужэем ..."), С. Ракіты („Рэспубліка працы") і В. Шэмпэля („Песьня будаўніцтва").

Трэба нашаму БДВ пашырыць выданьне масавых песень на словы пролетарскіх поэтаў.


Выданьне Дзяржаўнага Выдавецтва Беларусі. Адказны рэдактар МІХАСЬ ЧАРОТ.


# ШАХМАТЫ № 7

Пад рэдакцыяй А. А. КАСЬПЕРСКАГА і Я. Е. КАМЯНЕЦКАГА.

## Міжнародны конкурс „Чырвонай Беларусі"

### КОНКУРСНЫЯ ЗАДАЧЫ

Дэвіз № 13 „Індустрыя"




**Белыя:** Кра1, Фf2, Лс6 і е7, Сg7 і g8, Кb2 і d3 пb3... (9)

**Чорныя:** Кра3, Лh7, Се8 і g1, Кс3 і d1, пп. а6 і е4... (8)

Мат у 2 хады

Дэвіз № 14 „Жывём"



**Белыя:** Крf1, Фf6, Ла4 і е6, Сс8 і h6, Кс4, і g5, пп. е2, g2... (10)

**Чорныя:** Крg4, Фа5, Ла3 і b5, Сb1 і f4, Кb4 і b6, пп. g3, h4, h5... (11)

Мат у 2 хады

## VII Усесаюзны шахматна-шашачны зьезд

10 кастрычніка ў Маскве, у Калённай зале Дому Саюзаў, адчыняецца VII усесаюзны шахматна-шашачны зьезд.

Да VII шахзьезду па ўсіх кутках Савецкага Саюзу праведзена вялікая падрыхтоўчая праца, якая праводзілася пад лёзунгам перабудовы ўсёй шахматна-шашачнай працы тварам да вытворчасьці, павышэньня грамадзка-палітычнай і вытворчай актыўнасьці шырокіх пластоў шахматыстых і шашыстых.

Спартакіяды на прадпрыемствах, міжраённыя спаборніцтвы, краявыя рэспубліканскія адборачныя чэмпіянаты шырокай хваляй праходзілі па ўсім Савецкім Саюзе і глыбока ўскалыхнулі шахматна-шашачную грамадзкасьць. Шахзьезды на мясцох не толькі паказалі, але і пацьвердзілі, што шахматна-шашачны рух у СССР за апошнія гады значна ўзрос і акрэп.

Праведзеныя спаборніцтвы выявілі нямала таленавітай моладзі, якая ў шмат якіх спаборніцтвах заняла першыя месцы.

VII усесаюзны шахматна-шашачны зьезд павінен не толькі падвесьці вынікі праробленай працы, але і намеціць шляхі далейшага разьвіцьця шахматна-шашачнага руху ў суадпаведнасьці з задачамі соцыялістычнага будаўніцтва.

Падрыхтоўчая праца па БССР ужо скончана.

Дэлегацыя БССР на зьезьдзе будзе складзена з 26 асоб.

Для ўдзелу ва Усесаюзным шахматным турніры, на падставе папярэдніх спаборніцтваў, вылучаны наступныя тавары шы: **А. Касьперскі** — пераможца менскага чэмпіонату; **Верасаў**— рабочы пабудовы Дома Друку; **Мазэль** — ЦСПСБ; **М. Сіліч**— Віцебск, акулярная ф-ка; **Падольны** — Полацк і **Сташэўскі**— Магілеў.

У спаборніцтвах на пяршынства па лініі ЎсеЦСПС выяжджае каманда менскіх харчавікоў у складзе 6 рабочых.

На дзелавую частку зьезду, якая адчыняецца 20 кастрычніка, з рашаючым голасам пасылаюцца т. т. **Мазэль**— Менск, **Гольдбэрг**—старшыня шахматна-шашачнай секцыі ЦСПСБ, **Кузьняцоў**—ВСФК Бел., **Камянецкі** — рабочы з-ду імя Варашылава, **Кейлес** — рабочы шорнай фабрыкі „Усход" (Менск), **Гарадзецкі**—рабочы швейнай фабрыкі імя Дзяржынскага (Бабруйск) і па адным дэлегату ад Гомеля і Віцебска.

2 кастрычніка адчыняецца II малы шашачны чэмпіянат СССР, у якім ад БССР будуць прымаць удзел: Гардзевіч, Ліхадзіеўскі і Ракігніцкі (Менск); Зісэрсон, Берлінкоў і Храпуновіч (Віцебск) і Красьніцкі (Магілеў).

Старшынёй беларускай дэлегацыі зацьверджан т. Мазэль.

## Усесаюзны чэмпіянат композытараў за 1930 г.

Распачаўся Ўсесаюзны чэмпіянат композытараў за 1930 г. Па разьдзелу двух-ходовак удзельнічае 25 чалавек; у гэтым разьдзеле ад БССР прымае ўдзел т. Камянецкі. Вынікі чэмпіянату будуць зьмешчаны ў апошнім нумары „Чырвонай Беларусі" за гэты год.

## Міжнародны шахматны турнір у Паўднёва-Славіі

Турнір на курорце Блейг скончыўся бліскучай перамогай чэмпіону сьвету Алёхіна, які правёў увесь турнір без аднаго пройгрышу $+20^1/_2$ з 26, апярадзіўшы бліжэйшага конкурэнта на $5^1/_2$ ачкоў; II прыз — Багалюбоў $+15$. III — Німцовіч $+14$, IV—VII падзялілі Флёр, Каждан, Штольц і Відмар па $+13^1/_2$. Далей сьледвалі Тартаковер$+13$, Косьціч, Шпільман па $+12^1/_2$ і г. д.

Як паведамляе буржуазны друк, Алёхін быў у лепшай форме, у той час, як яго праціўнікі былі не ва ўдары. Аб гэтым сьведчыць усё цячэньне турніру. Лепшым сьведкай наступная партыя паміж ім і адным з галоўнейшых прэтэндэнтаў на пяршынства сьвету.

Белыя: А. Алехін—Чорныя: А Німцовіч.

1. е1—е4, е7—е6; 2. d2—d4, d7—d5; 3. Кb1—с3, Сf8—b4; 4. Кg1—е2, d5:е4; 5. а2—а3, Сd4:С3+; 6. Ке2:С3, Ф7—f5; 7. Ф2—f3! Белыя распачынаюць падрыў цэнтру 7... е4:f3; 8. Фd1:f3! Алёхін дазваляе ўзяць яшчэ адну пешку 8.. Фd8:d4? Німцовіч не задумваецца аб тэй небясьпецы, якая навісае над ім. 9. Фf3—g3!! Распачынаецца атака; пагроза белых 10. Кb5, Фе4+, 11. Се2, з двайным нападам на С7 і g7; 9... Кg8—f6; 10. Фg3:g7, Фd4 е5+; 11.. Сf1—е2, Аh8—g8; 12. Фg7 h6, Лg8—g6; 13. Фh6—h7, Сс8 d7. Патрэбна-ж куды-небудзь і калі-небудзь разьвіцца! 17. Сс1—g5, Сd7—с6; 15 о—о—о. Сс6:g2. Ужо можна складваць аружжа. Лh1—е1, Сg2—е4; 17. Се2—d5! Кf6:h5; 18. Лd1—d8+Кре8—f7; 19. Фh4:h5 і Німцовіч здаўся.

### Папраўка

У конкурснай задачы № 9, дэвіз „Піонэрская" („Ч. Б." № 16) **Бел.** ладзьдзя b6 павінна стаяць на b5.

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 2124. 7.800 экз. Галоўлітбел № 1031.


B0000002073799